Беларускі шлях

дрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
пухсуская вул. д. № 12

кцыя адчынена ад 1 дс 2 гадз. пасьля поудня.
ністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
кцыя пакідае за сабой права паляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру(на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

46. Менск. Аўторак 21 мая 1918 г. Год I

Абавязковая пастанова.

Датычучая спосабау проці пошэстных хваробау.

§ 1. Дзеля нідапушчэння распаусюджэння заразных обау у г. Менску, патрэбно каб аб каждым выпадку едамлялося як магчыма барджэй санітарнай паліцыі.

Для гэтаго усе міліцэйска-паліцэйскія вучасткі у Мен назначаюцца пунктамі заявау аб выпадках фэброуна-заных кваробау і павінны быць азначаны адпаведнымі надмі.

§ 2. Жыхароу дзеля іх уласнаго інтарэсу просяць ра ніадкладныя заявы у бліжэйшым мейсцу аб усякім выку гэтакіх занедужань.

§ 3. Дактары, фэльчары і акушоркі *абавязуюцца* суна і магчыма скора рабіць гэтыя заявы на асобных рэрацыйных картках заразных хваробау, якія выдавацімуц з Местовай Управы.

§ 4. Мусяць заяуляцца: Джума, халера, проказа, пляты тыфус, столбняк, зваротная фэбра, малярыя, брушны фус, дэзынтэрыя, дыфтэрыт, шкарлятына, адзер, сыфіліс, кі шанкр, трыппэр, тубэркулез, заражэнне трыхінамі, занныя надскурныя хваробы, сабачае шаленства, сыбірская за і знедужання, якія даюць падайзрэнне аб гэтых хвабах.

§ 5. Ніспоуненне гэтай пастановы карацімецца грашом штрафам да 500 марак.

§ 6. Пастанова гэтая прыймае сілу ад дня яе абвешння.

Менск, 17 мая 1918 году.

Комэндант
фон-ФРАНКЕНБЭРГ
Палкоунік.

Абвешчэнне.

Датычучае змагання с квотніцтвам

1) Хто за тавар альбо за работу запатрабуе надмеру ысокую цану, т. е. цану якая відзіма ні адпаведае цраувівай вартасьці тавару ці работы, карацімецца грашовым трафам да 10000 марак, ці пазбауленнем вольнасьці да) гадоу ці абоім карам разам. Адначасна таргоуля ці прэдыемство могуць быць зачынены альбо на час, альбо на усёды. Прыгавор будзе публікавацца.

2) Гандляры, рамесьнікі і фабрыканты абавязаны на апатрабаванне ураду нямецкай паліцыі прэдставіць даныя б мейсцу купоулі і закупачных цэнах таварау, якія яны аюць. У выпадку ніймення гэтых даных цана на тавары удзе назначана нямецкімі уладамі.

3) Заявы аб нідазволеным квотніцтве павінны скіроуацца у урад нямецкай паліцыі Койданауская вуліца № 28.

У заяве павінны быць паказаны прозьвішчо і адрэс аго хто робіць заяву, і тае асобы цроці якой яна скірована, так сама тавар ці работа, за якую на думку таго хто адае заяву патрабуюць надмерна высокую цану і яе вы окасьць.

МЕНСК
6 мая 1918 р.

Комэндант
фон-ФРАНКЕНБЭРГ.
Палкоўнік.

АБВЕСТКА.

Менская Местовая Управа гэтым даводзіць да агульнаго ведама, што у Будоунічым аддзеле Управы, у Ауторак 21 мая у 12 гадзін дня адбудзецца устны торг, ператоржка і сараунаванне у закрытых копэртах на дрэуляныя баракі і іншыя рэчы с складау на **Курасоушчыне** і з другіх складау.

Асобы ахвочыя да торгу могуць аглядаць баракі і інш. рэчы на мейсцу, а кандыцыі да торгу штодня ад 10 гадзіны з рана да 4 гадзіны дня у Будоунічым аддзеле Управы.

Да часу торгу павінен быць паложаны залог у 5% прапанаванай сумы.

Член Управы
Іважынэр **В. Цывінскі.**
Дзелавод **А. Гноінскі.**

Менск 21/V.

Эпідэмыя рэакцыі.

Ніудалая вайна, банкроцтво старога парадку і салдацкая пугачоушчына з яе соцыялізмом «зделанным у Туле». (made in Tula) нарабіла такіх штук, што людзі у акупіраванных землях безмерна рады, што адчапіліся ад большэвіцкіх рэформатароу. Нікаторыя кінуліся за-моцна у праза, адрэкаюцца ад соцыялізму і нават ад дэмакратызму і пудзяцца па моцнай уласьці.

«Тульскі» соцыялізм абарачываець Вялікаросію шыбкімі крокамі у аравійскую пустэльню, дзе з мейсца на мейсцо пераходзяць розныя «красногвардзейцы», комісары «з атары», каторыя трымаюць мірных абыватэляу, як бы пад татарскай навалай рабуюць, накладаюць контрыбуцыі і соцыялізуюць, ужо пачынаючы ад Оршы, чужыя кішэні. Сам народ вялікарускі ніколі ні арганізуець Эуропэйскаго парадку, хіба што з'явіцца зноу стары самадзержауны кій. Моцнай сярэдняй клясы там німа. Утопісты Ленін патроху прызнаець, што патрэбен кій, патрэбны царскія афіцэры, каб зрабіць нешта па кшталт паліцэйскаго войска. Vox populi—скора там будзе цар! Вялікарусы гэта самадзеужауныя «чалавекі»,—альбо большэвіцкі камісар, альбо цар.

На Украіне дробныя землеробы-уласнікі, той моцны дробна-буржуазны творчы элемэнт, каторы можа быць фундамэнтам дзержавы, скінуу соцыялістычную Раду, за Радай зляцеу з нашай суседкі як дым увесь тульскі соцыялізм і усе эканамісты кажуць, што Украіна уратавалася гэтым ад эканамічнаго заніпадку. Калі рэакцыя пойдзе там правей кадэтоу, то усякаму дэмакрату ужо забаліць сэрцо. Калі аглядзім усе акраіны бывшай Імпэрыі, то зауважым, што нідзе ужо ні відаць у жывых ні адной Рады, выбраннай народам у часе рэвалюцыі, апрыч Беларускай Рады.

Доля Беларускай Рады.

Беларуская Рада выбрана Усебеларускім конгрэсам з 1700 чалавек. Былі прэдстаунікі ад кожнай воласьці, горада, ад усіх нацыянальных арганізацыяу, ад беларусау—воінау усіх арміяу, фронтоу. Ні адна нацыя у б. Расіі ні мела такого зьезду усей зямлі.

Прайшлі 4 месяцы; за гэты час Рада мела многа крытыкау, але нацыянальную ідэю адраджэння беларускай дзержаунасці яна данясла да сягоннашняго дня; зрабіла гэта як магла і як разумела.

Гаспадарская мудрасць нашаго народу вымагаець пры цяперашніх варунках другой тактыкі і другой палітыкі, каб выцягнуць нашу змучэнную Бацькоушчыну на дарогу славы, дабра і вольнасьці. У вугол гэтаго павінна быць паложэна мудрая зямельная Эуропэйская рэформа. Да гэтаго Рада прызываець у Сэкрэтарыят новых людзей і новыя краевыя сілы з усіх станоу народу. Палітыка гэта дыктуецца дзержаунай мудрасьцю.

Будзем спадзевацца, што наша Рада дажывець і да другого конгрэсу і здасьць яму адчот аб самым цяжкім пэрыодзе гісторыі Беларусі.

Аб нас.

(С прэссы).

Віленскі «Новый Вѣстникъ» у № 45 друкуе допіс артыкул з Менску пад аглаукам «В Бѣлорусской Радѣ», у якім пішацца аб беларускіх справах:

«У настрою беларускіх дзеячоў меншчыны . [«минскаго края»] у апошнія часы ідзець рэзкі зварот у бок зближэння з Нямеччынай. Пад уплывам гэтаго звароту у настрою шырокіх колау беларускіх дзеячоў, з беларускай рады выйшлі прэдстаўнікі партыяў чыста вялікарускіх складу мысьлі і способу чыннасьці, у тым ліку і нікаторыя прэдстаўнікі земскаго і местоваго самаупраўлення, укомплектованнаго дзякуючы хібам выбарнаго закону з асоб с пэўнай вялікарускай орыентацыяй, чужых мейсцовым інтарэсам і пахілам. За тое у беларускую раду уліваюцца элемэнты праўдзіва мейсцовыя, дзеячы беларускаго прэдстаўніцтва, з яскрава азначанай заходняй орыентацыяй. Характэрна і насьведчаючы, што беларускія народовыя соцыялісты і прэдстаўнікі «Беларускай соцыялістычнай грамады» ні пакінулі рады, а паўзялі учасьце у тым *гістарычным* яе пасядзэнні у якім было вызначано, што доля Беларусі цяпер і у будучыне цесна дакранаюцца і інтарэсы ле зьвязываюцца толькі з Нямеччынай, аб чым і зроблены адпаведныя прэдстаўлення у Бэрлін. Адарванне ад Вялікаросіі, векамі прыгнятаўшай край ужо было абвешчане раней і гэто было повадам для адходу ад рады тых групп і партыяў, каторыя уяўлялі Беларусь толькі як частку Вялікарускай фэдэрацыі. Беларускія дзеячы аказаліся больш дальнавідзячымі і зрэлымі у гэтым і зразумелі, што ядынае выйсьце з тупіка для Беларусі—гэта эканамічны зьвязак з Нямеччынай. Толькі гэты зьвязак адчыняе шырокую дарогу прамежнай дзержаве паміж Заха дам і Усходам, дзержаве, ку турныя і эканамічныя інтарэсы, якой больш схіляюцца да Нямеччыны, чым да Масковіі.»

Агульныя весткі.

— Бачучы на значнае прасуванне наперад нямецкаго войска на заходнім фронце, Нямецкія ўлады дазваляюць варочацца бэльгійскім уцекачом на свае родныя мейсцы. Зварот ідзець памалу, бо край моцна пацярпеў ад вайны. Нямецкія ўлады даюць уцекачом матэрыяльную помач.

«Германія» №...а, новаго

— Выўшы ангельскі ...ацілася да да справаў харчавання ... момэнт, занедужаў ад сьцісклаго сваім падтрымоўвання тых самых кроўнаго ...овых нормаў, якія ...ея адысьці са увёў для усіх жыхароў ...ыя селяне

(«Германія» № ...а ў хату

— 14 і 15 мая у ...скаго па-

адбыўся сход селянскаго зьвязку, на якім шырока абмаўляліся патрэбы селянства. Селянскі дэпутат д-р Кроне сказаў паміж іншым, што селянскія зьвязкі стаяць на п..., што усе грамадзяне дзержа... становяць адну сям'ю і што нідамагання аднэй группы грамадзян цягнуць за сабой бяду для другіх і для усяго гасударства.

(«Германія» № 226).

— Па звесткам 15 мая нямецкімі падводнымі лодкамі затоплены ангельскія параходы уемнасьцю 11.500 тонн.

(«Фосс.» газэта № 248).

— Кангрэсам Амэрыканскай Рэспублікі адкінуто трэбаванне прэзыдэнта рэспублікі Вільсона сабе дыктаторскаго паўнамоцтва».

(Газэта 10 арміі № 574).

— Французы, у каторых ўласныя ваенныя рэзэрвы вычэрпаны—змушаюць сваіх чорнаскурых падданых уступаць у армію. Да 1916 году яны падвязлі у баевыя лініі 600,000 нэграў афрыканцаў. Нэгры ні добра пераносяць клімат Эўропы і шмат з іх паміраець ад сухотаў і другіх хвароб.

(Газэта 10 ар. № 573).

Баку. Цэнтр нэфтоваго промысла занят большэвікамі.

(Германія № 228).

— Па весткам з Бэрліна ад 16 мая—патоплены нямецкімі падводнымі лодкамі ангельскія параходы уемнасьцю 25.000 тонн.

(Германія № 228).

— Глаўны камітэт соцыялістаў - рэвалюцыянэра... занес пратэст у народную ...аду французскіх соцыяліста... у Парыжу проціў міжнародн...ай палітыкі большэвікоў. Яны вымагаюць выключэння большэвікоў з інтэрнацыяналу.

(Германія № 228).

— Вывоз харчоў з Румыніі і Украіны - з уражаю 1917/18 мелося вывезьці з Румыніі у Аўстрыю—482,803, ў Гэрманію 385,850 тон. хлеба. Вывезено з Румыніі у Гэрманію —у 1917 г. 6 мільёнаў яек, у 1918 г.—5,300,000. Украіна мае даставіць да 17-го жніўня 60,000,000 пудоў хлеба па цане 5 р. 80 к.— 6 р. 40 к. Авёс, жыто і кукуруза—5 р. Яек мае быць дастаўлено 500,000,000 штук. 6/10—у Гэрманію, 4/10—у Аўстрыю па цане 27½ фэнігаў за штуку.

(Nordd. Alldem, Zeit, № 249).

БЭРЛІН 18/V. Каля берагоў Англіі патоплены нямецкімі падводнымі лодкамі Аніпскія параходы наагул уемнасьцю 13.000 тонн.

Kreuz. Zeitung. № 251).

ЛОНДАН 16/V. Перад за... ...ем гэрманцамі і белай ...дыяй Гэльсінгфорсу і Свіа...а былі ўзарваны у фін... заліву 7 расійскіх пад...ых лодак, 4 амэрыканскіх ангельскіх.

(Krenz—Zeit, № 250)

— Лорд Керзон член ва... габінэту у прамове да ...нічных корэспондэнтаў назваў тры пункты як ангельскія умовы міру:

Мір павінен быць справядлівы як для вялікіх так і для малых народаў, гоноровы, каб ні уніжаў гонару нікога з супраціўнікаў. Трывалы каб абезпечыць сьвет і будучыя пакаленні.

(Dz.. Wil № 116.)

— «Bernes Tagebl.» падае, што нібыто ідуць перагаворы аб конфэрэнцыі нэйтральных дзержаваў з мэтай пачаць шырокія заходы для таго каб зрабіць мір.

(Dz. Wil.. № 116)

Весткі з Расіі.

— Цікавыя для характэрыстыкі большэвіцкіх дзеячоў у Расіі паказання далі сьведкі на судзе быўшаго коміссара ваеннаго флота Дыбенко·

Сьведак Фішман гаворыць аб абароне Нарвы, каторым кіраваў «чрезвычайный штаб»: «Штаб трэ'было рэорганізаваць, бо яго праца ішла нінармальна. Асабліва ні адпаведала патрэбі праца Крыленко. Я і мае таварышы неколькі разоў паднімалі пытанне аб безчыннасьці Крыленкі. Мы лічылі раней што ваеннае дзело знаемо усім членам «чрезвычайнаго штаба», а у тым ліку і Крыленко, але потым пераканаліся, што з усіх іх—як ад казла малака»..

Сьведак Нейбут: Становішчо было крытычным. У Нарве з ніцярплівасьцю чакалі помачы. Даведаўшыся што ідзець Дыбенко с парцізанамі Нейбут кінуўся яму на спатканне і каля Ямбургу быў прыняты Дыбенкай у вагоні.

У вагоні сьведку здзівіў такі образ: сядзело неколькі чалавек, пілі і вялі саўсім ні рэволюцыйную гутарку—

«Здорово-ж мы учора у Петроградзі падгульнулі—гаварыў нехта—аж сягоння галава баліць».

«Ці у вас у Нарве спірту многа?—запытаўся Дыбенко.

Ні нібезпечнасцю для Нарвы, ні нямецкімі сіламі Дыбенко і яго штаб ні цікаваліся, хаця вояўнічо і гаварылі «шапкамі закідаем да Раўлю дойдзем...»

Але нават з Нарвы Дыбенко уцек ні дачакаўшыся прыходу немцаў, пакінуўшы на успамін аб сабе і сваёй компаніі прыказы аб стане аблогі, аб ачыстцю сьнегу і аб тым каб усе купцы і банкіры явіліся «в понедѣльник на собраніе».

— «На што запатрабавалася яўка,—у гэтым ніграматным прыказе ні упаміналося» —кажа сьведак.

Такія то яны,—людзі каторыя казалі, што толькі яны могуць суменна служыць народу!

«Усім па роўну»

У аднэй з валасьцёў Спасскаго павету, Казанскай губ. селяне зрабілі падзел усяе зямлі згодна с прынцыпам: «усім па роўну». Дзялілі і на асобаў да земляробства саўсім ні прычастных.

У скутку на душу прыйшлося па ½ дзесяціны. [П. Т. А.]

П. Т. А. ад 10 гм. паведамляе з Самары: Арганізаваны «поволжскій комиссаріат по немѣцким дѣлам», каторы будзе разглядаць усе справы датычучыя нямецкіх колоністаў у Паволожжу. У задання камітэту ўходзіць—арганізацыя самапраўлення у колоніях па савецкім асновам. Поўноўладства комісарыяту працягнуцца да першаго з'езду колоністскіх совдепоў.

Усім саветам а так сама харчовым камітэтам Ленін падаў гэткую тэлеграму:

Пецярбург. ў нібывалым катастрофічным становішчу. Німа хлеба. Раздана апошняя рэшта хлеба й бульбянай мукі. Чырвоная сталіца на краі загібелі, контр-рэволюцыя ўжо падняла сваю галаву ды накіроўвае ніздаволенне массаў проці Савета Народных Комісароў. Нашыя клясовыя ворагі маняцца замарыць нас голадам. Толькі напружэнне ўсіх сілаў можа памагчы й выратаваць Пецярбург. Ад імяні Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі трэбую дапамогі Пецярбургу.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Сярод украінцаў 19 мая закончэна паверачная запісь на грамадзянскія эшалоны дзеля адпраукі на Украіну.

Адход эшалона будзе гэтымі днямі.

Першае пасядзэнне новавыбранкай еурэйскай абшчыны адбылося у салі «Парыж» учора 20 мая дзе было выслухіванне, глауным чынам, фракцыйных дэкляряцыяу. Прэніі досіць гарачыя. Было даложэно, паміж іншым, і а рэшыцельным атказе ад учасьця у справах абшчыны безпартыйных, па спіску № 9, еурэяу, нідавольных перамогай на выбарах прэдстаунікау сыанізму і «бунда».

Губ. Зем. Управа атрымаушы дазвол ад губ. сабрання на трыдцаці-тысячны крэдыт на апеку над дзяцьмі, дэмонстратыуна выкінутымі прытулкам чадкідышау Т-ва „Міласэрдзія" (загадывае там „вядомы" адвакат Поніквіцкі) за борт *у дзень адчынення сабрання*, у хуткім часе уладжываецьі свой прытулак. Дзеля гэтаго т-во „Міласэрдзія" падняло проціу губ. зем. управы скандал, што апошняя, адпускаючы шмат гадоу дзяцінаму прытулку субсідзыю і ні бачучы падрахункау, патрэбавала перадачы справу прытулка у свае рукі, на што, пасьля «сьпешнай» легалізацыі т-ва на новых асновах, былі перэданы ні справы і нірухомасьці з інвэнтаром прытулку, а *адны дзеці* (у відзе дэманстрацыі).

Благасьць вышэй апісанаго пастунку т-ва «Міласэрдзія» прызналі амаль аднагалосна і «правыя» і «левыя» з земскіх гласных.

Парахвіяне Дамініканскаго Касьцелу, знайходзючы пуцем добрахвотных, ахвярау новыя грошы, зноу пачалі сьпешную рэстаурацыю унутрэнняй часьці хораму.

Замясьціцель загадчыка Мінскай р.-к. епархіей кс. о. Рурк вярнууся с паездкі у Вільню:— Коуна, куды ен ездзіу па пытанню, а духоуна адміністратыуным раздзелу сумежных парахвіяу.

Рад вялікіх накраж і грабежствау за апошнія дні (Ново-Романоуская, у семьі уцекача Шварца 36000 р.; з вагона на на ст. Менск Л. Р. ж. д. папіросау і махоркі купца Івянскаго на 40000 р. і інш.) у нашым месцы пабудзіу упрауленне ваеннаго паліцмэйстра намеціць рад мер дзеля узмацавання местовай ахраны, а так сама дзеля палепшэння мэтодау барацьбы с праступнасьцю з боку крымінал. паліцыі.

Хлеб прыватнымі крамамі дольнаго рынку апошнімі днямі прадаецца адкрыта па 1 р. 80 к. фунт.

Каубаса с каніны, на што спэцыяльнаго дазволу ад нямецкай улады ні трэба, прадаецца па 2½ р. за фунт.

Уволены у адстаУку б. упрауляючы віленскай р.-к. епархіей кс. Міхалькевіч астаецца у Вільне і далей да назначэння сабе прэемніка, на што са стараны Рыма папскай буллы яшчэ німа.

У Менск на жыцельство, як цяпер стало вядома, кс. Міхалькевіч ні переедзе, рашыушы ні умешывацца ні у якую палітыку.

У бонавых крамах прадажа цукру па новых бонавых кніжках, дзеля агульных недачотау у арганізацыі справы сільна тармазіцца.

Пачнуць мабыць яго выдаваць ні раней чэрвеня.

Ліквідацыя мешчанскай управы, каторыя далучаецца да грамадзянскаго аддзелу местоваго самаупраулення, ідзець натта памалу, мабыць разлука са шмат гадовымі пасадамі за правілам яе не па нутру.

Да гэтаго часу яшчэ ні прыступілі да ліквідацыі архіва і учоту кассы. Рыюцца покуль што у вялізарных кучах пашпортных рэгістрацый і запылёных пасемейных спіскау.

Асобы с сьвядэцтвамі а... **адказе ад бонавых прадукт...** і на права аттрымання іх ... усадзеб і фальваркау павінн... прэдставіць гэтыя сьвядэтцтв... па вымаганню нямецкай ул... ды, у ауторак, 22 мая, у м... стовы харчовы камітэт дзел... абмены на новыя, інакш н... званы дакумэнт траціць мо...

Хаурус землеуладствау ск... кае на 21 мая на выбар... «па вельмі важнаму пытанн... што тычыцца інтарэсау уся... народанаселеня гэтай вобл... сьці" усіх і каждаго, ка... прышлюць павестку нямец... уласьці.

Апавешчэнне падпісано ста... шыней хауруса землеуласьн... кау графам Г. Э. Чапскім.

Прыгавораны нямецкім па... вым судом за хаванне узб...о за праціводзействіе уласьця... за абразу нямецкіх салдат, ... крадзеж, за нездачу у ср... (к 1 мая) войскавого мен... за нашэнне непрысвоенн... ваеннай формы і за абкр... дыванне начальнікау у ката... жную і звычайную турму ... срок ад ½ года да 5 гадоу... усяго 39 асоб.

Дзеля абароны герада ... **пошэсцьных хвароб**—чумы, х... леры, тыфуса, трасцы, шка... лятыны, сіфіліса і інш.—прэ... пісано жыхаром нямецкай к... мэндатурай, пад страхам штр... фа да 500 марак, хутка пав... дамляць аб кожным выпадк... санітарнай паліцыі, дзеля ч... го усе 5 міліцэйска-паліцэ... скіх вучасткау назначаны ме... сцам заяукі.

Барацьба с растоушчыцкі... цэнамі прыняла канкрэтн... формы. Комэндантура прап... навала гандляром, рэмесьн... кам і фабрыкантам прэ... ставіць ведамасьці аб мейсц... пакупкі і закупачных цэн... таварау, іначай прадажная ц... на будзе *назначэна*, а за п... вяліччаныя празмерна цэны ... штраф да 10,000 марак і з... чыненне прэдпрыяцій.

Жалабы на растоушчыцк... цэны павінны быць напра... лены нямецкаму паліцмэйстэр...



Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоуна... камандавання за 18 мая 1918 року.

ЗАХАД:

У раёні Кэммэлю артылерыйская чыннасьць знач... ўзмацнела пад вечар і поўнач. Сягоння раніцай тама... развіліся моцныя артылерыйскія бае. На іншых фронт... агонь так сама ажыўляўся ні адзін раз.

На паўднёвым беразі Анкры ангельцы атакавалі н... вялікімі сіламі раніцой. Яны ўлезлі ў Віллысюр — Анк... Спроба ніпрыяцеля пасунуцца далей па даліні Анкры ... удалася. Ні адзін раз пачынаўшаяся атака проці Корля... кур ні удавалася перад вёскаю.

На шмат мейсцоў фронту былі адкінуты атакі ангел... скіх і французкіх разьведчыкаў.

У баех і пры удачлівым прэдпрыемсьцве паўночн... Сэнт-Міхэля былі ўзяты палонныя.

У апошнюю ноч на Лёндон, Дуўр і іншыя ангельск... набережныя пункты былі удачліва скінуты бомбы.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтва **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.